

# Анна Ивановна КУЛЕШ

# Ганна Іванаўна КУЛЕШ

# Hanna Ivanauna KULESH

Веснавымі днямі гэтага года адзначае юбілей выдатны даследчык і цудоўны чалавек – прафесар Ганна Іванаўна Кулеш.

Ганна Іванаўна нарадзілася 13 красавіка ў Оршы (Віцебская вобласць). Тут сям'я апынулася ў пасляваенны час, але неўзабаве бацькі Г. І. Кулеш вярнуліся на радзіму – у Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці.

Пасля заканчэння Стаўбцоўскай сярэдняй школы № 2 Г. І. Кулеш паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыла ў 1977 г., атрымаўшы дыплом з адзнакай па спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура».

У перыяд з 1979 па 1989 г. Ганна Іванаўна працавала ў Галоўнай рэдакцыі выпуску і перакладаў саюзнай і замежнай інфармацыі Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БелТА).

У 1989 г. Г. І. Кулеш абірае навукова-педагагічны кірунак дзейнасці і паступае на філалагічны факультэт БДУ ў аспірантуру. За гады навучання ў аспірантуры пад кіраўніцтвам прафесара Л. М. Шакуна ёю была падрыхтавана і ў 1992 г. паспяхова абаронена кандыдацкая дысертацыя «Шляхі і спосабы папаўнення грамадска-палітычнай лексікі на сучасным этапе».

У гэтым жа годзе перспектыўная і таленавітая даследчыца пачала выкладчыцкую дзейнасць на філалагічным факультэце БДУ: са снежня 1992 г. Ганна Іванаўна працавала выкладчыкам кафедры беларускай мовы, пазней яна змяніла кафедру, і ў 1993 г. заняла пасаду выкладчыка, у 1994 г. – дацэнта, а ў 2017 г. – прафесара кафедры гісторыі беларускай мовы (з 2019 г. кафедра беларускага мовазнаўства).

Асноўнай сферай навуковых інтарэсаў Г. І. Кулеш доўгі час былі праблемы фарміравання лексікі беларускай мовы (асабліва ў няпростыя і вызначальныя 1920–30-я гг.), пытанні гістарычнай і сучаснай лексікалогіі і лексікаграфіі. Значную навуковую ўвагу Ганна Іванаўна ўдзяляла таксама пытанням культуры беларускага маўлення, вынікам чаго стала цэлая серыя публікацый у часопісе «Роднае слова» ў пачатку 2000-х гг. У коле навуковых пошукаў Г. І. Кулеш былі і застаюцца розныя аспекты гісторыі беларускай літаратурнай мовы, што звязана са шматгадовым выкладаннем ёю студэнтам-філолагам аднаіменнай вучэбнай дысцыпліны.

Г. І. Кулеш – аўтар і суаўтар многіх грунтоўных выданняў: манаграфіі «Беларуская мова і мовазнаўства: XIX стагоддзе» (2013), дапаможнікаў «Асаблівасці беларускага словаўжывання» (2003), «Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны» (2015), «Культура прафесійнага маўлення юрыста» (2019), хрэстаматыі ў дзвюх частках для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей «Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941)» (2005, 2008), электроннага вучэбна-метадычнага комплексу «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (2019), хрэстаматыі «Гісторыя беларускай мовы» (2022).

Прадметам увагі Г. І. Кулеш былі праблемы навучання не толькі ў вышэйшай, але і ў агульнаадукацыйнай школе. У суаўтарстве ёю створаны наступныя вучэбна-метадычныя дапаможнікі для абітурыентаў: «Беларуская мова. Тэставыя заданні» (2004), «Рэпетытар па беларускай мове: фанетыка, арфаэпія і правапіс» (2008), «Рэпетытар па беларускай мове. Марфалогія і правапіс» (2009), «Рэпетытар па беларускай мове. Сінтаксіс і пунктуацыя» (2010), «Рэпетытар па беларускай мове. Лексікалогія. Фразеалогія. Словаўтварэнне» (2012). Для школ з беларускай мовай навучання выдавецтвам «Народная асвета» выпушчаны зробленыя Г. І. Кулеш пераклады на беларускую мову вучэбных дапаможнікаў «Біялогія» для 6-га (2009),

7-га (2010), 8-га (2010), 10-га (2009) класаў, «Чалавек і свет» для 6-га класа (2010).

З цягам часу Ганна Іванаўна пачала сур'ёзна вывучаць пытанні выкарыстання беларускай мовы ў юрыдычнай сферы, гісторыю беларускамоўнага заканадаўства, асаблівасці і спецыфіку мовы заканадаўчых тэкстаў. Гэта праблематыка ўсебакова прадстаўлена ў шматлікіх публікацыях. Абагульненнем даследавання названага праблемнага поля стала манаграфія «Мова беларускага заканадаўства ХХ стагоддзя: генезіс і эвалюцыя» (2015) і доктарская дысертацыя «Фарміраванне і развіццё мовы беларускага заканадаўства ХХ – пачатку ХХІ ст. (на матэрыяле беларускамоўных заканадаўчых тэкстаў)» (навуковы кансультант – прафесар М. Р. Прыгодзіч), бліскуча абароненая 27 верасня 2016 г.

Распрацоўку тэмы доктарскага даследавання Г. І. Кулеш працягвае ў навукова-даследчай рабоце «Беларуская тэрміналогія права: тэорыя і практыка лексікаграфічнага апісання» ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы».

Цікавасць да мовы юрыспрудэнцыі сярод іншага звязана са шматгадовай выкладчыцкай працай на юрыдычным факультэце БДУ, дзе Ганна Іванаўна ўдзельнічае ў фарміраванні маўленчай культуры будучых юрыстаў. Акрамя гэтага, яна праводзіць заняткі ў Інстытуце перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ.

Г. І. Кулеш заўсёды была і застаецца актыўным удзельнікам міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый і чытанняў. Яе імя шырока вядома ў айчынным і замежным мовазнаўчым асяроддзі.

За гады плённай працы Ганнай Іванаўнай напісана каля 170 навуковых і навукова-метадычных работ, падрыхтаваны 3 магістры і 2 кандыдаты філалагічных навук.

Прафесіяналізм, дасведчанасць, педагагічнае майстэрства Г. І. Кулеш высока цэніць кіраўніцтва БДУ: у 2003 г. яна атрымала Грамату БДУ, у 2008 і 2011 гг. – Ганаровую грамату БДУ, у 2021 г. – падзяку рэктара і нагрудны знак «100 гадоў БДУ». 28 кастрычніка 2022 г. Ганна Іванаўна была ўзнагароджана памятным знакам «У гонар 100-годдзя Інстытута беларускай культуры» за плённае супрацоўніцтва з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ў галіне папулярызацыі беларускай мовы і за намаганні па дасягненні парытэту беларускай і рускай моў у юрыдычнай сферы.

Не менш высока за прафесійныя і чалавечыя якасці Ганну Іванаўну любяць і паважаюць калегі, вучні і студэнты. Аўтару гэтых радкоў пашчасціла вучыцца і рабіць першыя крокі ў навуцы пад мудрым і ўважлівым кіраўніцтвам Ганны Іванаўны. Яна ўмела спалучае ў педагагічнай працы неабходную патрабавальнасць і настойлівасць з мяккасцю і далікатнасцю. Ганна Іванаўна ніколі не абмяжоўваецца пратакольнымі абавязкамі навуковага кіраўніка, яе падтрымка і дапамога адчуваюцца заўсёды. У асобе Г. І. Кулеш спалучаюцца надзвычай адказны, дысцыплінаваны, прынцыповы вучоны і сціплы, спагадлівы, тактоўны чалавек. Яна заўсёды праяўляе добразычлівасць і ўважлівасць у працы са студэнтамі, але ў той жа час цвёрда трымаецца прынцыпаў прафесійнай этыкі, сумленна захоўвае выкладчыцкую рэпутацыю.

Шчыра віншуем шаноўную Ганну Іванаўну з юбілеем! Жадаем здароўя, бадзёрасці, новых прафесійных дасягненняў, асабістага шчасця!

***А. В. Губкіна***[1]

[1]*Елена Васильевна Губкина* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Алена Васільеўна Губкіна* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Elena V. Gubkina*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

*E-mail:* palvas@tut.by